ДЗЯРЖАЎНАЯ УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«УНІВЕРСІТЭТ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ»

# ПРАГРАМА
# ЎСТУПНАГА ІСПЫТУ (ЭКЗАМЕНУ) У МАГІСТРАТУРУ

для атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі
па спецыяльнасці Археалогія

Мінск 2023

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

Юрэцкі С.С., дырэктар дзяржаўнай установы “Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”, кандыдат гістарычных навук.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

кафедрай сацыяльна-гуманітарных дысцыплін
(пратакол №10 ад 10.02.2023);

Саветам ДУА “Універсітэт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”
(пратакол №8 от 30.03.2023).

# І. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма ўступнага экзамену для абітурыентаў, якія паступаюць у Універсітэт НАН Беларусі для атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі, распрацавана ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі І ступені і тыпавымі навучальнымі праграмамі дысцыплін, якія адпавядаюць профілю абранай спецыяльнасці Археалогія.

*Мэтай* уступнага экзамену з'яўляецца комплексная праверка тэарэтычнага ўзроўню падрыхтоўкі абітурыентаў, абагульненне і ўзаемная ўвязка ведаў, атрыманых імі ў працэсе навучання на І ступені вышэйшай адукацыі, а таксама высвятленне сфарміраванасці ў асоб, якія паступаюць у магістратуру, навыкаў і ўменняў, неабходных для рацыянальнай арганізацыі навукова-даследчага працэсу і вырашэння задач у сферы адпаведнай спецыялізацыі гістарычных ведаў.

Падчас падрыхтоўкі да ўступнага экзамену і ў працэсе яго вырашаюцца наступныя *задачы:*

– выяўленне ў абітурыентаў неабходнага для навучання ў магістратуры ўзроўню ведаў па археалогіі;

– высвятленне наяўнасці ў выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі цэласнага ўяўлення аб узнікненні і развіцці чалавецтва, яго матэрыяльнай і духоўнай культуры на падставе рэчыўных, археалагічных крыніц;

– вызначэнне ўзроўню асэнсаванасці выпускнікамі сутнасці гісторыі, неабходнасці сістэматызацыі і дакладнай інтэрпрэтацыі археалагічных помнікаў;

– устанаўленне грунтоўнасці ведання абітурыентамі навуковых канцэпцый археалогіі ў яе сувязі з іншымі галінамі навуковых ведаў;

– высвятленне ступені сфарміраванасці ў будучых магістрантаў навуковага падыходу да вывучэння з'яў гісторыі, які грунтуецца на авалоданні характэрнымі для сучаснай археалагічнай навукі метадалагічнымі падыходамі да вывучэння і даціроўкі помнікаў.

Абітурыенты павінны *ведаць*:

– асноўныя паняцці і тэрміналогію археалагічнай навукі;

– галоўныя дасягненні і адкрыцці ў галіне археалогіі, працы і імёны выбітных айчынных і замежных даследчыкаў;

– важнейшыя метадалагічныя парадыгмы археалагічнай навукі, класіфікацыю рэчыўных крыніц, палявыя, кабінетныя і лабараторныя прыёмы археалагічных даследаванняў, метады вывучэння і даціроўкі помнікаў;

– асноўныя этапы развіцця матэрыяльнай культуры чалавецтва, культурна-гістарычную спадчыну беларускага народа;

*умець:*

– аналізаваць археалагічныя помнікі ў іх суаднесенасці з разнастайнымі гістарычнымі падзеямі і фактамі, з іншымі сферамі

сацыяльнай жыццядзейнасці, вызначаць месца помніка ў кантэксце археалагічнай перыядызацыі;

– арыентавацца ў асаблівасцях археалагічных культур розных плямёнаў і народаў;

– ацэньваць асноўныя дасягненні ў галіне матэрыяльнай культуры чалавецтва і выкарыстоўваць адпаведныя веды ў сваёй прафесійнай дзейнасці;

– выкарыстоўваць у гістарычных даследаваннях базавыя веды па археалогіі, арыентавацца ў навуковай і даведачнай літаратуры;

– аргументавана разважаць аб сучасным стане археалагічнай навукі.

# II. ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## РАЗДЗЕЛ І. УВОДЗІНЫ

### Тэма 1.1. Археалогія, яе месца сярод гістарычных навук і ў сістэме гуманітарных ведаў. Метадалогія археалогіі. Асноўныя метады палявых археалагічных даследаванняў

Крыніцы, прадмет і задачы археалогіі. Сувязь з іншымі гуманітарнымі навукамі. Выкарыстанне ў археалагічных даследаваннях даных антрапалогіі, палеагеаграфіі, палеазаалогіі, палеабатанікі, палеанталогіі і іншых прыродазнаўчых навук.

Асноўныя прынцыпы археалогіі. Магчымасці археалогіі ў аб'ектыўнай ацэнцы гістарычнага мінулага чалавецтва. Паняцці "археалагічная крыніца" і "археалагічны помнік". Асноўныя метады навуковага аналізу археалагічных крыніц. Віды помнікаў. Археалагічная культура. Крытэрыі выдзялення археалагічных культур. Археалагічная культура і этнас. Археалагічная тыпалогія і класіфікацыя. Археалагічная храналогія і перыядызацыя. Метады даціроўкі ў археалогіі.

Прынцыпы палявых археалагічных даследаванняў. Археалагічныя разведкі. Методыка вывучэння паселішчаў. Методыка вывучэння пахавальных комплексаў. Палявая дакументацыя.

### Тэма 1.2. Гісторыя ўзнікнення і развіцця археалагічнай навукі

Узнікненне археалогіі. Этап назапашвання рэчыўнага матэрыялу. Калекцыянаванне антычных старажытнасцяў і класічная археалогія. Асноўныя адкрыцці канца XVIII - XIX стст. Пачатак усходняй археалогіі. Першабытная археалогія і эвалюцыйная тэорыя. Станаўленне археалогіі як гістарычнай навукі. Асноўныя канцэпцыі археалогіі канца XIX - XX стст. Канцэпцыі археалагічнай культуры, культурна-гістарычны падыход. Неаэвалюцыянізм і этнаархеалогія, школа "новай археалогіі". Экалогія і сістэмны падыход. Асноўныя напрамкі развіцця археалогіі на сучасным этапе.

## РАЗДЗЕЛ ІІ. АРХЕАЛОГІЯ ПЕРШАБЫТНАГА ЧАСУ

### Тэма 2.1. Каменны век

Праблема паходжання чалавека. Асноўныя тэорыі антрапагенезу. Эвалюцыя гамінідаў і праблема прарадзімы чалавека сучаснага тыпу.

Ранні і сярэдні палеаліт. Перыядызацыя і храналогія. Гісторыя вывучэння. Асаблівасці развіцця матэрыяльнай культуры. Асноўныя помнікі ранняга і сярэдняга палеаліту на тэрыторыі Еўропы. Праблема першапачатковага засялення тэрыторыі Беларусі, палеалітычныя помнікі і знаходкі.

Позні палеаліт на тэрыторыі Беларусі. Палеагеаграфія эпохі. Помнікі. Гісторыя іх вывучэння і даследавання. Пытанні храналогіі і культурнай

інтэрпрэтацыі. Асаблівасці матэрыяльнай культуры. Характарыстыка крамянёвага інвентару. Гаспадарчыя заняткі насельніцтва. Праблемы генезісу і гістарычнага лёсу.

Фінальны палеаліт на тэрыторыі Беларусі. Асаблівасці палеагеаграфіі позналедавікоўя Беларусі. Напрамкі засялення тэрыторыі Беларусі ў фінальным палеаліце. Фінальнапалеалітычныя культуры Беларусі, іх храналогія і перыядызацыя, месца ў агульнаеўрапейскім культурным кантэксце.

Лінгбійская культура. Гісторыя вывучэння і даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Тэрыторыя распаўсюджання. Асноўныя помнікі. Характарыстыка крамянёвага інвентару. Праблемы генезісу і гістарычнага лёсу.

Валкушанская культура. Гісторыя вывучэння і даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Тэрыторыя распаўсюджання. Асноўныя помнікі. Характарыстыка крамянёвага інвентару. Праблемы генезісу і гістарычнага лёсу.

Грэнская культура. Гісторыя вывучэння і даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Тэрыторыя распаўсюджання. Асноўныя помнікі. Характарыстыка крамянёвага інвентару. Праблемы генезісу і гістарычнага лёсу.

Свідэрская культура. Гісторыя вывучэння і даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Тэрыторыя распаўсюджання. Асноўныя помнікі. Характарыстыка крамянёвага інвентару. Праблемы генезісу і гістарычнага лёсу.

Характарыстыка эпохі мезаліту. Асаблівасці палеагеаграфіі галацэна Беларусі. Культурныя правінцыі ў мезаліце Еўропы. Асаблівасці развіцця матэрыяльнай культуры. Асноўныя тыпы паселішчаў і асаблівасці іх тапаграфіі. Характарыстыка гаспадарчых заняткаў. Праблема пераходу ад мезаліту да неаліту.

Кундская культура. Гісторыя вывучэння і даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Тэрыторыя распаўсюджання. Асноўныя помнікі. Характарыстыка крамянёвага інвентару. Праблема генезісу і гістарычнага лёсу.

Сожская і днепра-дзяснінская культуры. Гісторыя вывучэння і даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Тэрыторыя распаўсюджання. Асноўныя помнікі. Характарыстыка крамянёвага інвентару. Праблемы генезісу і гістарычнага лёсу.

Кудлаеўская культура. Гісторыя вывучэння і даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Тэрыторыя распаўсюджання. Асноўныя помнікі. Характарыстыка крамянёвага інвентару. Праблема генезісу і гістарычнага лёсу.

Янíславіцкая культура. Гісторыя вывучэння і даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Тэрыторыя распаўсюджання. Асноўныя помнікі.

Характарыстыка крамянёвага інвентару. Праблема генезісу і гістарычнага лёсу.

Агульная характарыстыка эпохі неаліту. Неаліт Беларусі ў кантэксце неалітызацыі Еўропы. Спецыфічныя рысы неаліту Беларусі. Палеагеаграфія сярэдняга галацэну Беларусі. Асноўныя тыпы паселішчаў і асаблівасці іх тапаграфіі. Заняткі і духоўны свет неалітычнага насельніцтва. Праблемы перыядызацыі і храналогіі.

Днепра-данецкая культура на тэрыторыі Беларусі. Гісторыя даследавання. Тэрыторыя. Асноўныя помнікі. Матэрыяльная і духоўная культура насельніцтва. Пытанні храналогіі і перыядызацыі. Паходжанне і гістарычны лёс.

Прыпяцка-нёманская культура. Гісторыя вывучэння і даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Тэрыторыя распаўсюджання. Асноўныя помнікі. Характарыстыка матэрыяльнай культуры. Праблема генезісу і гістарычнага лёсу.

Нёманская культура. Гісторыя вывучэння і даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Тэрыторыя распаўсюджання. Асноўныя помнікі. Характарыстыка матэрыяльнай культуры. Праблема генезісу і гістарычнага лёсу.

Верхнедняпроўская культура. Гісторыя вывучэння і даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Тэрыторыя распаўсюджання. Асноўныя помнікі. Характарыстыка матэрыяльнай культуры. Праблема генезісу і гістарычнага лёсу.

Нарвенская культура. Гісторыя вывучэння і даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Тэрыторыя распаўсюджання. Асноўныя помнікі. Характарыстыка матэрыяльнай культуры. Праблема генезісу і гістарычнага лёсу.

Культура тыповай грабеньчата-ямкавай керамікі. Гісторыя вывучэння і даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Тэрыторыя распаўсюджання. Асноўныя помнікі. Характарыстыка матэрыяльнай культуры. Праблема генезісу і гістарычнага лёсу.

Культура шарападобных амфар. Гісторыя вывучэння і даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Тэрыторыя распаўсюджання. Асноўныя помнікі. Характарыстыка матэрыяльнай культуры. Роля насельніцтва культуры шарападобных амфар у неалітызацыі тэрыторыі сучаснай Беларусі. Краснасельскія крэмнездабыўныя шахты. Праблема генезісу і гістарычнага лёсу.

**Тэма 2.2. Бронзавы век**

Агульная характарыстыка эпохі. Еўрапейскія сістэмы перыядызацыі і храналогіі. Асаблівасці бронзавага веку Беларусі ў агульнаеўрапейскім кантэксце. Асноўныя тыпы помнікаў. Гаспадарчыя заняткі і духоўны свет насельніцтва.

Культуры шнуравой ксрамікі на тэрыторыі Беларусі. Асноўныя прыметы кола культур шнуравой керамікі. Элементы "старашнуравога гарызонта" ("А-гарызонта") на тэрыторыі Беларусі.

Група (культура) палескай шнуравой керамікі. Гісторыя вывучэння і даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Тэрыторыя распаўсюджання. Асноўныя помнікі. Характарыстыка матэрыяльнай культуры. Праблема генезісу і гістарычнага лёсу.

Помнікі культуры шнуравой керамікі Панямоння. Гісторыя вывучэння і даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Тэрыторыя распаўсюджання. Асноўныя помнікі. Характарыстыка матэрыяльнай культуры. Праблема генезісу і гістарычнага лёсу.

Сярэднедняпроўская культура. Гісторыя вывучэння і даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Тэрыторыя распаўсюджання. Асноўныя паселішчы і могільнікі. Характарыстыка матэрыяльнай культуры. Праблема генезісу і гістарычнага лёсу.

Паўночнабеларуская культура. Гісторыя даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Роля культуры шнуравой керамікі ў развіцці паўночнабеларускай культуры. Тарфянікавыя стаянкі. Асаблівасці матэрыяльнай культуры. Асноўныя кірункі гаспадарчай дзейнасці. Духоўны свет носьбітаў паўночнабеларускай культуры. Пытанні генезісу і гістарычнага лёсу.

Помнікі тшцінецкага культурнага кола на тэрыторыі Беларусі. Гісторыя даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Праблема ідэнтыфікацыі і вылучэння лакальных культур (груп) помнікаў. Тшцінецкая культура (група помнікаў). Сосніцкая культура (група помнікаў). Паселішчы. Пахаванні. Асаблівасці матэрыяльнай культуры. Пытанні генезісу і гістарычных лёсаў.

Позні бронзавы век на тэрыторыі Беларусі. Праблема вылучэння посттшцінецкага перыяду і заключнага этапу эпохі бронзы на тэрыторыі Беларусі. Могільнікі і паселішчы з комплексамі позняга перыяду бронзавага веку. Праблема іх храналогіі. Бронзавыя вырабы позняга перыяду бронзавага веку. Культура ранняй штрыхаванай керамікі.

**Тэма 2.3. Жалезны век**

Агульная характарыстыка. Перыядызацыя і храналогія жалезнага веку Еўропы. Гальштатская і латэнская культуры ў Заходняй і Сярэдняй Еўропе.

Скіфы і сарматы. Уплыў скіфскай культуры на плямёны паўднёвай Беларусі.

Жалезны век лясной зоны Усходняй Еўропы. Агульная характарыстыка эпохі і праблемы этна-культурнага развіцця насельніцтва на тэрыторыі Беларусі.

Мілаградская і паморская культуры. Гісторыя вывучэння. Храналогія. Тэрыторыя. Матэрыяльная культура. Сацыяльна-эканамічнае і духоўнае развіццё насельніцтва. Праблема этнічнай прыналежнасці. Паходжанне і гістарычны лёс.

Зарубінецкая культура. Гістарыяграфія. Тэрыторыя. Паселішчы і могільнікі. Рэчавы комплекс. Асаблівасці палескага і верхнядняпроўскага (тыпу Чаплін і Кісцяні-Чачэрск) варыянтаў культуры. Праблемы храналогіі, генезісу і этнічнай прыналежнасці.

Культура поздняй штрыхаванай керамікі. Гісторыя вывучэння культуры. Тэрыторыя рассялення плямёнаў. Паселішчы і жытлы. Матэрыяльная культура і гаспадарчая дзейнасць. Паходжанне, храналогія і этнічная прыналежнасць.

Днепра-дзвінская культура. Гістарыяграфія. Тэрыторыя распаўсюджання і лакальныя асаблівасці. Характар паселішчаў і жытлаў. Матэрыяльная культура і пытанні датавання. Гаспадарчая дзейнасць, сувязі з суседнімі культурамі. Паходжанне, храналогія і этнічная прыналежнасць.

Пшэворская культура. Агульная характарыстыка культуры. Цэнтральнаеўрапейскія храналагічныя схемы старажытнасцяў рымскага перыяду (схема К. Гадроўскага і Я. Тэйрала). Пшэворская культура і яе ўплывы ва Усходняй Еўропе.

Кіеўская культура. Гістарыяграфія. Тэрыторыя. Агульная характарыстыка культуры. Верхнедняпроўскі варыянт кіеўскай культуры. Паселішчы і жытлы. Могільнікі. Рэчавы комплекс. Праблемы храналогіі, генезісу, этнічнай прыналежнасці.

Вельбарская культура. Гістарыяграфія. Агульная характарыстыка. Вельбарская культура ў Беларусі. Пахавальны абрад. Рэчавы комплекс. Праблемы храналогіі, генезісу, этнічнай прыналежнасці.

Чарняхоўская культура. Гістарыяграфія. Агульная характарыстыка (паселішчы і жытлы, могільнікі, рэчавы комплекс). Праблемы храналогіі, генезісу і этнічнай прыналежнасці. Чарняхоўскі імпарт у Беларусі.

Пражская культура. Гісторыя вывучэння. Тэрыторыя. Паселішчы. Жылыя і гаспадарчыя пабудовы. Могільнікі і пахавальны абрад. Характарыстыка керамічнага і рэчавага комплексу. Праблемы храналогіі. Напрамкі славянскай міграцыі. Помнікі тыпу Карчак і Сукаў-Дзедзіцэ. Асаблівасці раннеславянскіх комплексаў на Беларускім Палессі.

Калочынская культура. Гісторыя вывучэння. Тэрыторыя. Катэгорыі помнікаў. Рэчавы комплекс. Праблемы датавання. Асаблівасці калочынскай культуры на тэрыторыі Беларусі. Генезіс і этнічная інтэрпрэтацыя.

Пянькоўская культура. Гісторыя вывучэння пянькоўскіх старажытнасцяў. Тэрыторыя. Паселішчы і могільнікі. Рэчавы комплекс. Скарбы "старажытнасцяў антаў". Храналогія, генезіс, праблема этнічнай прыналежнасці.

Банцараўская культура. Гістарыяграфія. Тэрыторыя. Паселішчы. Матэрыяльная культура. Праблемы пахавальнага абраду. Храналогія, генезіс, этнічная інтэрпрэтацыя.

Тушамлінская культура. Гісторыя вывучэння старажытнасцяў тыпу верхняга пласта Тушамлі. Тэрыторыя. Тыпы помнікаў. Рэчавы комплекс. Храналогія, генезіс, этнічная інтэрпрэтацыя.

Культура доўгіх курганоў. Гістарыяграфія. Культура пскоўскіх доўгіх курганоў (тэрыторыя, могільнікі і пахавальны абрад, паселішчы, рэчавы комплекс, храналогія, генезіс, праблемы этнічнай інтэрпрэтацыі). Смаленска-полацкія доўгія курганы (тэрыторыя, асаблівасці пахавальнага абраду, паселішчы, рэчавы комплекс, праблемы датавання і этнічнай прыналежнасці).

## РАЗДЗЕЛ III. АРХЕАЛОГІЯ СЯРЭДНЕВЯКОЎЯ І РАННЯГА НОВАГА ЧАСУ

### Тэма 3.1. Археалогія ранняга сярэдневякоўя

Культура тыпу Лукі-Райкавецкай. Гісторыя вывучэння. Тэрыторыя. Агульная характарыстыка культуры. Помнікі тыпу Лукі-Райкавецкай у Беларусі. Паселішчы і могільнікі. Рэчавы комплекс. Сацыяльная стратыфікацыя паселішчаў (племянныя цэнтры, адкрытыя рамесніцка-гандлёвыя пункты, протагарады).

Раннеславянскія культуры апошняй чвэрці I тысячагоддзя н.э. на тэрыторыі Усходняй Еўропы (валынцаўская, роменская і боршаўская). Гісторыя вывучэння. Тэрыторыя. Агульная характарыстыка культур (паселішчы, могільнікі, рэчавы комплекс). Храналогія. Сувязь з летапіснымі плямёнамі.

Усходнія славяне і суседнія плямёны яцвягаў і літоўцаў ў заходніх раёнах Беларусі. Крывічы, дрыгавічы, радзімічы. Вывучэнне каменных курганоў і каменных магіл. Усходнелітоўскія курганы. Каменныя курганы яцвягаў, каменныя магілы. Характар пахавальнага абраду. Этнавызначальныя ўпрыгожанні. Характар побытавых рэчаў.

Сельскія паселішчы IX-XIII стст. Тапаграфія сельскіх паселішчаў і іх памеры. Тып забудовы, асноўныя віды жылых і гаспадарчых пабудоў. Земляробства і жывёлагадоўля, вясковае рамяство. Пахавальныя помнікі. Феадальныя замкі. Прыметы феадальных замкаў. Вішчынскі замак.

Паходжанне старажытных гарадоў на тэрыторыі Усходняй Еўропы. Вызначэнне горада, яго адрозненне ад іншых умацаваных і неўмацаваных паселішчаў. Найстаражытнейшыя гарады па пісьмовых крыніцах і археалагічных даных (Кіеў, Ноўгарад, Полацк). Агульныя заканамернасці ва ўзнікненні старажытных гарадоў. Этымалогія назваў гарадоў. Эканамічныя, сацыяльныя і палітычныя перадумовы ўзнікнення гарадоў.

Гандлёвыя сувязі старажытных гарадоў IX-XIII стст. Месца і роля гандлю ва ўзнікненні гарадоў. Асноўныя гандлёвыя шляхі і храналогія прыярытэтных кірункаў. Тавары экспарту і імпарту. Сацыяльная складовая гандлёвых адносінаў. Імпартныя рэчы-знаходкі, выяўленыя падчас раскопак беларускіх гарадоў IX—XIII стст.

Матэрыяльная культура і рамёствы ў старажытных беларускіх гарадах. Віды рамёстваў і іх развіццё ў храналогіі. Узаемасувязі рамёстваў і гандлю. Рамёствы і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Спецыфічныя рысы гарадской археалогіі: вывучэнне тапаграфіі паселішча, стратыграфічныя гарызонты, слаі і праслойкі, драўляная забудова, прывязка і фіксакцыя, плошча даследавання, магутнасць культурных напластаванняў і г.д. Арганізацыя археалагічных работ, тэхнічнае забеспячэнне, тэхніка бяспекі. Узоры раскопак феадальных гарадоў і іх вынікі.

Старажытны Полацк. Тапафафічная структура і матэрыяльная культура. Роля і месца ў беларускай археалогіі. Этапы вывучэння і асноўныя даследчыкі. Элементы тапаграфічнай структуры горада IX-XVII стст.: замкі, пасады, манастыры (тэрыторыя, храналогія, культурны слой). Асноўныя рысы матэрыяльнай культуры, характэрныя асаблівасці рамяства. Гандаль і залатарства, рамяство і сельская гаспадарка. Горад і акруга.

Старажытны Мінск. Праблема месцазнаходжання і паходжання. Тапаграфія і абарончыя збудаванні. Планіроўка і забудова. Жылыя і гаспадарчыя пабудовы. Матэрыяльная культура і гаспадарчая дзейнасць гараджан. Мінскі храм.

Старажытны Тураў. Гісторыя вывучэння. Даследчыкі. Асаблівасці тапаграфіі, характарыстыка культурных напластаванняў. Забудова: драўляная і манументальная. Заняткі насельніцтва. Гандлёвыя і культурныя сувязі з іншымі землямі.

Гарады Тураўскай зямлі. Асноўныя даследчыкі. Тапаграфія і храналогія Пінска, Берасця, Давыд-Гарадка, Слуцка, Клецка, Рагачова і інш. Абарончыя ўмацаванні, заняткі насельніцтва.

Старажытныя гарады Беларускага Панямоння (Гродна, Наваградак, Ваўкавыск). Асноўныя даследчыкі. Тапаграфія, абарончыя збудаванні, забудова. Помнікі манументальнага дойлідства: пералік, характарыстыка, вытокі. Культурныя і гандлёвыя сувязі з паўночнымі і паўднёвымі краінамі па матэрыялах археалагічных раскопак. Матэрыяльная культура насельніцтва.

Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі IX-XVII стст. па матэрыялах археалагічных раскопак. Упрыгожванне побытавых рэчаў. Ювелірнае рамяство. Дэкаратыўная кераміка. Выяўленчае мастацтва. Вырабы з дрэва, косці, каменю, шкла. Мастацтва і рэлігія. Крыж Еўфрасінні Полацкай. Культурныя і іншыя ўплывы ў мастацтве IX-XVII стст.

Царкоўная і грамадская манументальная архітэктура Беларусі XI-XII стст. Першы хрысціянскі мураваны храм у Полацку. Гісторыя вывучэння, праблемы рэканструкцыі і храналогіі, аналогіі на суседніх землях. Полацкая архітэктурная школа XII ст.: помнікі, адметнасці, асаблівасці і традыцыі. Яе ўплыў на архітэктуру Смаленска. Гродзенская архітэктурная школа. Грамадская мураваная архітэктура XII ст. у гарадах Беларусі. Абарончая вежа ў Камянцы XIII ст. Яе аналогіі.

**Тэма 3.2. Археалогія позняга сярэдневякоўя і ранняга Новага часу**

Побытавая, масавая забудова і планіроўка ў сярэдневяковых гарадах Беларусі XIV-XVIII стст. Крыніцы па побытавой і масавай забудове, планіроўцы гарадоў XIV-XVIII стст. Даныя археалогіі, картаграфіі, пісьмовых крыніц. Змены ў гарадской тапаграфіі і іх прычыны. Культавыя і грамадскія пабудовы ў структуры беларускага горада XIV-XVIII стст.

Археалогія мястэчак на тэрыторыі Беларусі XIV-XVIII стст. Вызначэнне мястэчак і іх адрозненні ад іншых тыпаў пасяленняў. Даследчыкі мястэчак. Храналогія мястэчак, іх сацыяльны статус. Гаспадарка беларускіх мястэчак XIV-XVIII стст. Асаблівасці матэрыяльнай культуры.

Замкі ў Беларусі. Эвалюцыя паняцця замак ў XIV-XVIII стст. Храналогія замкаў. Этапы вывучэння. Асноўныя даследчыкі, літаратура. Замкі драўляныя і мураваныя. Матэрыяльная культура замкаў.

Вясковыя паселішчы XIV-XVIII стст. Асноўныя даследчыкі. Сістэма рассялення і яе адрозненне ад раннейшых перыядаў. Тыпы вясковых паселішчаў. Матэрыяльная культура. Феадальныя сядзібы.

Археалагічнае вывучэнне манументальнага дойлідства ў Беларусі. Архітэктура абарончых аб'ектаў і яе вывучэнне. Літаратура і даследчыкі. Гарадскія культавыя аб'екты ў Полацку, Віцебску, Гродна, Тураве, Мінску і іншых гарадах. Манастырскія комплексы ў буйных гарадах і мястэчках. Помнікі грамадскага дойлідства. Фарміраванне структуры цэнтра гарадоў у XVI-XVIII стст. на прыкладзе Мінска.

## ІІІ. ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

*Асноўная літаратура:*

1. Авдусин, Д. А. Основы археологии : [учеб. для вузов по спец. "История"] / Д. А. Авдусин. – М. : Высш. шк., 1989. – 333 с.
2. Авдусин, Д. А. Полевая археология СССР : [учеб. пособие для ист. спец. ун-тов] / Д. А. Авдусин. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Высш. шк., 1980. – 335 с.
3. Алексеев, Л. В. Археология и краеведение Беларуси, XVI в. – 30-е годы XX в. / Л. В. Алексеев ; под редакцией Б. А. Рыбакова ; Академия наук Российской Федерации, Институт археологии, Витебский областной историко-краеведческий музей. – Минск : Беларуская навука, 1996. – 205 с.
4. Алексеева, Е. М. Античные государства Северного Причерноморья / Е. М. Алексеева [и др.] ; отв. ред. Г. А. Кошеленко [и др.] ; АН СССР, Институт археологии. – М. : Наука, 1984. – 392 с.
5. Археалогія Беларусі : у 4 т. / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі. – Мінск : Беларуская навука, 1997-2001. – 3 Т.
6. Археалогія Беларусі : у 4 т. / Ш. І.Бекцінееў, Ю. М.Бохан, І. У.Ганецкая і інш.; Гал. рэд. В. М. Ляўко. Т.4, Помнікі XIV - XVIII стст. – Мінск : Бел. навука, 2001. – 597 с.
7. Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / складальнік Ю. У. Каласоўскі ; рэдкалегія: Т. У. Бялова (галоўны рэдактар) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2009 – 2011.
8. Ваганова, А. Н. История первобытного общества : происхождение человека : пособие для студентов / А. Н. Ваганова ; Белорусский государственный университет. – Минск : БГУ, 2013. – 109 с.
9. Дук, Д. У. Археалогія : вучэб.-метад. комплекс / Д. У. Дук ; Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Установа адукацыі "Полацкі дзяржаўны універсітэт". – Наваполацк : ПДУ, 2009. – 153 с.
10. Загарульскі, Э. М. Заходняя Русь IX-XIIIстст. : вучэб. дапам. для студэнтаў гіст. фак. ВНУ / Э. М. Загарульскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 239 с.
11. Колосов, А. В. Основы археологии : учеб.-метод. пособие / А. В. Колосов ; Министерство образования Республики Беларусь, Учреждение образования "Могилевский государственный университет им. А. А. Кулешова". – Могилев : МГУ, 2012. – 158 с.
12. Копытин, В. Ф. Каменный век на территории Белоруссии : учеб. пособие / В. Ф. Копытин ; Министерство народного образования БССР, Минский государственный педагогический институт им. А. М. Горького, Могилевский государственный педагогический институт им. А. А. Кулешова. – Минск : Могилевский пединститут, 1990. – 96 с.
13. Левко, О. Н. Введение в археологию : пособие / О. Н. Левко ; Министерство образования Республики Беларусь, Учреждение образования

"Могилевский государственный университет им. А. А. Кулешова". – Могилев : Издательский центр МГУ, 2009. – 96 с.
14. Мартынов, А. И. Археология : учеб. / А. И. Мартынов. – 7-е изд., перераб. и доп. – М. : Юрайт, 2012. – 460 с.
15. Мартынов, А. И. Археология : учеб. / А. И. Мартынов. – 6-е изд., перераб. – М. : Высш. шк., 2008. – 446 с.
16. Мартынов, А. И. Методы археологического исследования : учеб. пособ. / А. И. Мартынов, Я. А. Шер. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Высш. шк., 2002. – 239 с.
17. Тарасаў, С. В. Археалогія Беларусі : час, таямніцы, скарбы, людзі : нататкі археолага / С. В. Тарасаў. – Мінск : Беларусь, 2017. – 191 с.
18. Чарняўскі, М. М. Каменны век Беларусі : ілюстраваны канспект лекцый : вучэб.-метад. дапаможнік / М. М. Чарняўскі. – Мінск : Тэхналогія, 2011. – 61 с.

*Дадатковая літаратура:*

1. Алексеев, В. П. Становление человечества / В. П. Алексеев. – М. : Политиздат, 1984. – 462 с.
2. Алексеев, Л. В. Западные земли домонгольской Руси в историко-археологическом осмыслении / Л. В. Алексеев, В. П. Богданов ; Российская академия наук, Институт археологии, Московский государственный университет им. М. В. Ломоносова, Исторический факультет. – М. : Наука, 2009. – 335 с.
3. Алексеев, Л. В. Полоцкая земля / Л. В. Алексеев. – Полоцк : А. И. Судник, 2007. – 50 с.
4. Артеменко, И. И. Племена Верхнего и Среднего Поднепровья в эпоху бронзы / И. И. Артеменко ; [отв. ред. Д. А. Крайнов, П. М. Кожин] ; Академия наук СССР, Институт археологии. – М. : Наука, 1967. – 134 с.
5. Археологическое наследие Беларуси = Archaeological heritage of Belarus : из глубин тысячелетий, памятники дописьменной эпохи (1-е тысячелетие н. э.), археологическое наследие эпохи древней Руси, материальная культура Беларуси XIV—XVIII веков (между Западом и Востоком) : альбом / Национальная академия наук Беларуси, Институт истории ; составитель, автор вступительной статьи О. Н. Левко ; научн. ред. : А. А. Коваленя, О. Н. Левко ; пер. на англ. С. Д. Дерновича ; фото: А. В. Войтехович [и др.]. – Минск : Беларуская навука, 2012. – 190 с.
6. Березанская, С. С. Северная Украина в эпоху бронзы / С. С. Березанская. – Киев : Наук. думка, 1982. – 211 с.
7. Бохан, Ю. М. Мястэчкі вярхоўяў Віліі і неманскай Бярэзіны ў XV-XVIII стст. : (Па археалагічных і пісьмовых крыніцах): Дыс. канд. гіст. навук / Ю. М. Бохан. – Мінск : Б.в., 1994. – 266 с.
8. Бубенько, Т. С. Средневековый Витебск : Посад – Нижний замок (X – первая половина XIV в.) : моногр. / Т.С.Бубенько ; Министерство образования Республики Беларусь, Учреждение образования "Витебский государственный

университет им. П. М. Машерова". – Витебск : Издательство ВГУ, 2004. – 276 с.
9. Восточные славяне : историческая и духовная общность : материалы Международной научно-практической конференции, посвященной 15-летию Общества Кирилла Туровского (Гомель, 15–16 апреля 2008 г.) / [ред. : В. И. Коваль (отв. ред.), Е. И. Холявко, Е. В. Ничипорчик]. – Гомель : ГГУ, 2008. – 235 с.
10. Вяргей, В. С. Археалагічная навука ў Беларускай ССР 1919–1941 гг. / В. С. Вяргей ; пад рэд. Я. Г. Шмідта ; Акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 142 с.
11. Гуревич, Ф. Д. Древний Новогрудок : Посад - окольный город / отв. ред. А. Н. Кирпичников ; АН БССР, Институт археологии. – Л. : Наука. Ленингр. отд., 1981. – 159 с.
12. Гурина, Н. Н. Древние кремнедобывающие шахты на территории СССР / Н. Н. Гурина. – Л. : Наука, 1976. – 175 с.
13. Древнее Гродно : по материалам археол. раскопок 1932-1949 гг. / Н. Н. Воронин. – 236 с.
14. Друцк : Друцк и Друцкая волость (княжество) в IX-XII вв. Летопись древних слоев. Князья Друцкие и их владения в XIII-XVIII вв. Ремесло, промыслы, торговля (по данным археологии, нумизматики, письменных источников). Памятники архитектуры и объекты туризма / О. Н. Левко [и др. ] ; науч. ред. О. Н. Левко ; Национальная академия наук Беларуси, Институт истории. – Минск : Беларуская навука, 2014. – 617 с.
15. Дук, Д. У. Полацк XVI - XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццевай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д. У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2007. – 266 с.
16. Дук, Д. У. Археалагічныя комплексы пасадаў Полацка IX–XVIII стст. : (па выніках раскопак 2004–2012 гг.) / Д. У. Дук ; Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Установа адукацыі "Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт". – Новаполацк : ПДУ, 2014. – 252 с.
17. Дук, Д. У. Полацк і палачане (IX–XVIII стст.) / Д. У. Дук ; Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Установа адукацыі "Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт". – Наваполацк : ПДУ, 2010. – 179 с.
18. Егорейченко, А. А. Древнейшие городища Белорусского Полесья (VII–VI вв. до н. э. – II в. н. э.) / А. А. Егорейченко ; [науч. ред. В. В. Седов]. – Минск : [б. и.], 1996. – 148 с.
19. Егорейченко, А. А. Культуры штрихованной керамики / А. А. Егорейченко. – Минск : БГУ, 2006. – 207 с.
20. Загорульский, Э. М. Белая Русь с середины I тысячелетия до середины XIII века / Э. М. Загорульский. – 2-е изд., доп. – Минск : Четыре четверти, 2014. – 528 с.
21. Загорульский, Э. М. Вищинский замок, XII - XIII вв. / Э. М. Загорульский. – Минск : БГУ, 2004. – 158 с.

22. Загорульский, Э. М. Возникновение Минска / Э. М. Загорульский. – Минск : Изд. БГУ, 1982. – 356 с.

23. Загорульский, Э. М. Славяне : происхождение и расселение на территории Беларуси / Э. М. Загорульский. – Минск : БГУ, 2012. – 366 с.

24. Зализняк, Л. Л. Население Полесья в мезолите / Л. Л. Зализняк ; [отв. ред. Д. Я. Телегин] ; Академия наук Украинской ССР, Институт археологии. – Киев : Наукова думка, 1991. – 156 с.

25. Заяц, Ю. А. Заславль в эпоху феодализма / Ю. А. Заяц ; [ред. Г. В. Штыхов] ; Академия наук Беларуси, Институт истории. – Минск : Навука і тэхніка, 1995. – 206 с.

26. Зверуго, Я. Г. Верхнее Понеманье в IX–XIII вв. / Я. Г. Зверуго ; под ред. П. Ф. Лысенко ; Академия наук Белорусской ССР, Институт истории. – Минск : Навука і тэхніка, 1989. – 207 с.

27. Здановіч, Н. І. Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка / Н. І. Здановіч, А. К. Краўцэвіч, А. А. Трусаў. – Минск : Навука і тэхніка, 1994. – 72 с.

28. Исаенко, В.Ф. Неолит Припятского Полесья / В. Ф. Исаенко ; ред. Д. Я. Телегин ; Академия наук БССР, Институт истории. – Минск : Наука и техника, 1976. – 126 с.

29. Іоў, А. В. Старажытнае паселішча на Ясельдзе / А. В. Іоў, В. С. Вяргей ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі. – Мінск : Беларуская навука, 2012. – 172 с.

30. Калечиц, Е. Г. Памятники каменного и бронзового веков Восточной Белоруссии / науч. ред. Д. Я. Телегин ; Акад. наук Бел. ССР, Институт истории. – Минск : Наука и техника, 1987. – 158 с.

31. Калечиц, Е. Г. Первоначальное заселение территории Белоруссии / Е. Г. Калечиц ; научный редактор Б. Н. Гурский ; Академия наук Белорусской ССР, Институт истории. – Минск : Наука и техника, 1984. – 155 с.

32. Калечыц, А. Г. Палеалітычныя помнікі Беларусі : культурна-храналагічная ідэнтыфікацыя крыніц / А. Г. Калечыц, А. У. Коласаў, В. С. Абухоўскі ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі, Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. – Мінск : Беларуская навука, 2010. – 321 с.

33. Калечыц, А. Г. Человек и среда обитания : Вост. Беларусь : Камен. век / Е. Г. Калечиц. – Мінск : Экоперспектива, 2003. – 223 с.

34. Каробушкіна, Т. М. Насельніцтва Беларускага Пабужжа X-XIII ст ст. / Нац. акад. навук Беларусі. Інстытут гісторыі; Навук. рэд. П.Ф. Лысенка. – Мінск : Бел. навука, 1999. – 128 с.

35. Каханоўскі, Г. А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI-XIX стст. / Навук. рэд. Л. Д. Побаль. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 120 с.

36. Квятковская, А. В. Ятвяжские могильники Беларуси (к. XI-XVII вв.) = Jotvingiu kapinynai Baltarusjoje (Xi a. pab.-XVII a.) / А. В. Квятковская; Институт истории Литвы. – Вильнюс : Diemedzio, 1998. – 327 с.

37. Клейн, Л. С. Археологическая типология / Л.С.Клейн ; [Академия наук СССР, Ленинградский филиал Центра научно-технической деятельности, исследований и социальных инициатив, Ленинградское научно-исследовательское археологическое объединение]. – Ленинград : ЛФ ЦЭНДИСИ : ЛНИАО, 1991. – 447 с.

38. Клейн, Л. С. Время в археологии / Л. С. Клейн. – СПб. : Евразия, 2014. – 381 с.

39. Клейн, Л. С. Принципы археологии / Л.С.Клейн. – СПб. : Бельведер, 2001. – 150 с.

40. Колосов, А. В. Финальный палеолит и мезолит Посожья : моногр. / А. В. Колосов ; Министерство образования Республики Беларусь, Учреждение образования "Могилевский государственный университет им. А. А. Кулешова". – Могилев : МГУ, 2015. – 173 с.

41. Кошман, В І. Паселішчы міжрэчча Бярэзіны і Дняпра ў X-XIII стст. / В. І. Кошман ; Нац. акад. навук Беларусі, Інстытут гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 280 с.

42. Краўцэвіч, А. К. Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV-XVIII ст.ст. : Планіроўка, культурны слой / навук. рэд. М.А. Ткачоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 171 с.

43. Крывальцэвіч, М. М. Азярное 1 - паселішча эпохі бронзы на поўначы Палесся / Інстытут гісторыі Нац. АН Беларусі. Аддз. археалогіі. – Мінск : [ЦНБ НАН РБ], 1999. – 108 с.

44. Крывальцэвіч, М. М. Могільнік сярэдзіны III - пачатку II тысячагоддзяў да н.э. на Верхнім Дняпры - Прорва 1 / М.М.Крывальцэвіч ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі. – Мінск : Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2006. – 202 с.

45. Ксензов, В. П. Матэрыялы па археалогіі Беларусі = Materials on the archaeology of Belarus : [нав. Зб.] / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі. – Мінск : Інстытут гісторыі, 1957. – Загаловак вып. 8, 9, 11, 14, 22 : Материалы по археологии Беларуси. — № 13 : Мезолит Северной и Центральной Беларуси / В. П. Ксензов ; [нав. Рэд. І. М. Язэпенка]. – 2006. – 169 с.

46. Ксензов, В. П. Мезолит Северной и Центральной Беларуси / В. П. Ксензов ; навук. рэд. І. М. Язэпенка ; Інстытут гісторыі НАН Беларусі. – Мінск : Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2006. – 169 с.

47. Кухаренко, Ю. В. Зарубинецкая культура / Ю. В. Кухаренко ; [отв. ред. А. П. Смирнов] ; Академия наук СССР, Институт археологии. – М.: Наука, 1964. – 66 с.

48. Кухаренко, Ю. В. Могильник Брест-Тришин / Ю. В. Кухаренко ; Академия наук СССР, Институт археологии. – М.: Наука, 1980. – 126 с.

49. Лакіза, В. Л. Старажытнасці позняга неаліту і ранняга перыяду бронзавага веку Беларускага Панямоння / В. Л. Лакіза ; Нац. акад. навук Беларусі, Інстытут гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 342 с.

50. Левко, О. Н. Витебск / О. Н. Левко ; ред.: А. А. Коваленя [и др.] ; Национальная академия наук Беларуси, Институт истории. – Минск : Беларуская навука, 2010. – 334 с.
51. Левко, О. Н. Средневековые территориально-административные центры северо-восточной Беларуси : Формирование и развитие / О.Н. Левко ; Ин-т истории Нац. акад. наук Беларуси. – Мн. : Беларус. навука, 2004. – 278 с.
52. Лошенков, М. И. Городища милоградской культуры на территории Беларуси / М. И. Лошенков ; Национальная академия наук Беларуси, Институт истории. – Минск : Минская фабрика цветной печати, 2011. – 406 с.
53. Лысенко, П. Ф. Берестье / П. Ф. Лысенко ; [науч. ред. В. В. Седов] ; Академия наук Белорусской ССР, Институт истории. – Минск : Наука и техника, 1985. – 395 с.
54. Лысенко, П. Ф. Города Туровской земли / П. Ф. Лысенко ; ред. В. В. Седов ; Академия наук Белорусской ССР, Институт истории. – Минск : Наука и техника, 1974. – 197 с.
55. Лысенко, П. Ф. Туровская земля, IX-XIII вв. / П. Ф. Лысенко ; Нац. акад. наук Беларуси, Институт истории. – 2-е изд. – Минск: Бел. наука, 2001. – 266 с.
56. Макушников, О. А. Археология городских и сельских поселений Древней Руси IX–XIII веков : практ. рук. / О. А. Макушников ; Министерство образования Республики Беларусь, Учреждение образования "Гомельский государственный университет им. Франциска Скорины". – Гомель : ГГУ, 2015. – 47 с.
57. Макушников, О. А. Гомель с древнейших времен до конца XVIII века : историко-краеведческий очерк / О. А. Макушников. – 3-е изд., исп. и доп. – Гомель : Барк, 2013. – 243 с.
58. Медведев, А. М. Верхнее Понеманье в железном веке и раннем средневековье / А. М. Медведев ; Национальная академия наук Беларуси, Институт истории. – Минск : Беларуская навука, 2011. – 349 с.
59. Мельниковская, О. Н. Племена Южной Белоруссии в раннем железном веке / О. Н. Мельниковская ; [отв. ред. Ю. В. Кухаренко] ; Академия наук СССР, Институт археологии. – М. : Наука, 1967. – 192 с.
60. Митрофанов, А. Г. Железный век средней Белоруссии : VII - VI вв. до н. э.- VIII в.н.э. / А. Г. Митрофанов ; [науч. ред. Г. В. Штыхов] ; Акад. наук Бел. ССР, Институт истории. – Минск : Наука и техника, 1978. – 159 с.
61. Монгайт, А. Л. Археология в СССР / Акад. наук СССР. Институт истории материальной культуры. – М. : Изд-во Акад. наук СССР, 1955. – 436 с.
62. Римантене, Р. К. Каменный век Литвы / Р. К. Римантене. – Вильнюс : Мокслас, 1984. – 344 с.
63. Римантене, Р. К. Нида : поселение древних балтов : моногр. / Р. К. Римантене. – Вильнюс : Мокслас, 1989. – 209 с.

64. Римантене, Р. К. Палеолит и мезолит Литвы / Р. К. Римантене; АН ЛитССР, Институт истории. – Вильнюс : Минтис, 1971 [вып. дан. 1972]. — 203 с.

65. Русанова, И. П. Славянские древности VI-IX вв. между Днепром и Западным Бугом / И. П. Русанова. – М. : Наука, 1973. – 100 с.

66. Русов, П. А. Деревянные сооружения Менска XIII–XVII вв. : (опыт архитектурно-археологической реконструкции) / П. А. Русов ; под ред. С. А. Сергачева ; Академия наук Беларуси, Институт истории. – Минск : Навука і тэхніка, 1992. – 51 с.

67. Рыбаков, Б. А. Ремесло Древней Руси / Б. А. Рыбаков. – М. : Культура : Академический проект, 2015. – 715 с.

68. Рябцевич, В. Н. Нумизматика Беларуси / В. Н. Рябцевич. – Минск : Полымя, 1995. – 687 с.

69. Седов, В. В. Восточные славяне в VI - XIII вв. / В. В. Седов; АН СССР, Институт археологии. – М. : Наука, 1982. – 327 с.

70. Седов, В. В. Древнерусская народность : ист.-археол. исслед. / В. В. Седов ; Институт археологии Рос. акад. наук. – М. : Яз. славян. культуры (А. Кошелев), 1999. – 316 с.

71. Седов, В. В. Славяне ; Древнерусская народность : историко-археологические исследования : избранные труды / В.В. Седов. – М. : Знак, 2005. – 943 с.

72. Седов, В. В. Славяне в древности / В. В. Седов ; [ред. Н. В. Лопатин] ; Институт археологии Российской академии наук, Российский фонд фундаментальных исследований. – М. : Научно-производственное благотворительное общество "Фонд археологии", 1994. – 341 с.

73. Седов, В. В. Славяне в раннем средневековье / В. В. Седов ; [ред. Н. В. Лопатин] ; Институт археологии Российской академии наук, Российский гуманитарный научный фонд. – М. : Научно-производственное благотворительное общество "Фонд археологии", 1995. – 415 с.

74. Седов, В. В. Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья / В. В. Седов ; [отв. ред. А. Л. Монгайт] ; Академия наук СССР, Институт археологии. – М. : Наука, 1970. – 199 с.

75. Славянская археология, 1990 : Раннесредневековый город и его округа : Сб. ст. / Междунар. уния славян. археологии, Институт археологии Рос. акад. наук ; [отв. ред. : В. В. Седов, А. В. Чернецов]. – М., 1995. – 223 с.

76. Старажытныя шахцёры на Росі / М. М. Чарняўскі, В. Я. Кудрашоў, В. Л. Ліпніцкая ; пад рэд. У. Ф. Ісаенкі ; АН Беларусі, Інстытут гісторыі. – Минск : Навука і тэхніка, 1996. – 144 с.

77. Тарасаў, С. В. Полацк IX-XVII стст. : Гісторыя і тапаграфія / навук. рэд. Штыхаў Г. В. ; Нац. акад. навук Беларусі. Інстытут гісторыі. – 2-е выд. – Мінск : Бел. навука, 2001. – 182 с.

78. Ткачоў, М. А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII-XVIII стст. / М. А. Ткачоў ; АН БССР. Інстытут гісторыі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 142 с.

79. Трусаў, А. А. Манументальнае дойлідства Беларусі XI-XVIII стагоддзяў : Гісторыя буд. тэхнікі / А. А. Трусаў ; [навук. рэд. Г.В. Штыхаў]. – Минск : ТАА "Лекцыя", 2001. – 203 с.
80. Трусаў, А. А. Стары замак у Гродне XI-XVIII стст. : Гісторыка-археалагічны нарыс / А. А. Трусаў ; навук. рэд. Г. В. Штыхаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 79 с.
81. Чарняўскі, М. М. Касцяныя і рагавыя вырабы на паселішчах Крывінскага тарфяніку : неаліт - бронзавы век / М. Чарняўскі ; Нац. акад. навук Беларусі, Інстытут гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2007. – 75 с.
82. Чарняўскі, М. М. Неаліт Беларускага Панямоння / АН БССР. Інстытут гісторыі; нав. рэд. Д. Я. Цялегін. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 142 с.
83. Шаблюк, В. У. Сельскія паселішчы Верхняга Панямоння, XIV–XVIII стст. / В. У. Шаблюк ; пад рэд. Я. Г. Звяругі ; Акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі. – Мінск : Беларуская навука, 1996. – 119 с.
84. Шмидт, Е. А. Археологические памятники и их охрана / Е. А. Шмидт. – Смоленск : кн. изд., 1961. – 70 с.
85. Шмидт, Е. А. Племена верховьев Днепра до образования Древнерусского государства : днепро-двинские племена (VIII в. до н. э. – III в. н. э.) / Е. А. Шмидт. – М. : Прометей, 1992. – 207 с.
86. Штыхаў, Г. В. Крывічы : па матэрыялах раскопак курганоў у Паўночнай Беларусі / Г. В. Штыхаў; АН Бел. Інститут гісторыі; навук. рэд. М. А. Ткачова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 189 с.
87. Штыхаў, Г. В. Матэрыялы па археалогіі Беларусі = Materials on the archaeology of Belarus : [нав. зб.] / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі. – Мінск : Інстытут гісторыі, 1957. – № 16: Курганны могільнік Ізбішча-Дзвінаса / Штыхаў Г. В. ; [нав. рэд. В. М. Ляўко]. – 2008. – 248 с.
88. Штыхаў, Г. В. Узнікненне Лагойска : гісторыка-археалагічны нарыс / Г. В. Штыхаў ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 104 с.